**Што новага**
**Ў РЭСПУБЛІЦЫ**

# БЕЛАРУСЬ ПРАДОЎЖЫЛА ЭКАНАМІЧНЫ ДЫЯЛОГ З СУСВЕТНЫМ БАНКАМ

Пытанні актывізацыі эканамічнага дыялога паміж нашай рэспублікай і Сусветным банкам былі абмеркаваны на сустрэчы прэм'ер-міністра Сяргея Лінга з пастаянным прадстаўніком гэтай міжнароднай фінансавай арганізацыі ў Беларусі Сяргеем Куліком. Яна адбылася 10 жніўня ў Доме ўрада.

Сяргей Кулік выказаў удзячнасць кіраўніку беларускага ўрада за тое, што ў шчыльным рабочым графіку прэм'ер-міністра вялікая ўвага адведзена пытанням далейшага супрацоўніцтва з Сусветным банкам. Сяргей Лінг у сваю чаргу падкрэсліў, што ён заўсёды сур'ёзна адносіўся да кантактаў з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі і надаваў гэтаму вялікае значэнне. Ён таксама адзначыў, што нашай краіне ёсць што прадэманстраваць у эканамічным напрамку. З удзелам вучоных і практыкаў выпрацаваны падыходы да перспектыўнага развіцця народнай гаспадаркі на перыяд да 2015 года. У гэтых рамках распрацаваны шэраг праграм і канцэпцый. Беларусь крытыкуюць за адсутнасць рэформ, адзначыў Сяргей Лінг, але разам з тым ніхто не спрабаваў глыбока ўнікнуць, у якіх умовах жыве наша рэспубліка. На думку кіраўніка ўрада, развіццё чыста рынačных адносін у Беларусі немагчыма па шэрагу прычын, адна з якіх - наступствы чарнобыльскай катастрофы. Мы не аспрэчваем канцэпцыю і стратэгію міжнародных эканамістаў, падкрэсліў прэм'ер-міністр. Але Беларусь перш за ўсё разлічвае на свае сілы.

Сучасны этап узаемаадносін нашай краіны і Сусветнага банка  будзе развівацца на абслугоўванні бягучых крэдытных праектаў і падрыхтоўцы новых грантаў, а таксама на арганізацыі тэхнічнай дапамогі кансультацыйнага і інфармацыйна-аналітычнага характару.

ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ